# Важнейшыя патрабаванні да дысертацыі і аўтарэферата

Гэтыя патрабаванні выкладзены ў Часовым палажэнні аб прысуджэнні вучоных ступеняў (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12 мая 1994 г., № 328), Палажэннем аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў (праект, чэрвень 1996 г.), а таксама Інструкцыяй па афармленню дысертацый, якая зацверджана пастановай прэзідыума БелВАКа ад 4 кастрычніка 1994 г., № 3.

Названыя пастановы арыентуюць на выкананне важнейшых патрабаванняў да зместу і формы дысертацыі і аўтарэферата. Аднак пяцігадовая практыка напісання, афармлення і падрыхтоўкі дысертацый да абароны ў Нацыянальным інстытуце адукацыі, напісанне аўтарэфератаў, сам працэс абароны і падрыхтоўкі дакументаў у ВАК Рэспублікі Беларусь паказваюць, што ў дысертантаў пастаянна ўзнікаюць тыповыя “цяжкія” пытанні і праблемы. З улікам іх адзначым самыя істотныя моманты, якія трэба мець на ўвазе ў працэсе падрыхтоўкі дысертацыі і аўтарэферата.

1. Структурная частка дысертацыі “Агульная характарыстыка работы” павінна цалкам адпавядаць гэтай частцы ў аўтарэфераце.

2. У структурнай частцы “Агульная характарыстыка работы” і ў дысертацыі, і ў аўтарэфераце ў наступнай паслядоўнасці раскрываюцца:

актуальнасць тэмы дысертацыі;

сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі;

аб’ект даследавання;

прадмет даследавання;

гіпотэза даследавання;

мэта даследавання;

задачы даследавання;

метадалагічная аснова даследавання;

метады даследавання;

навуковая навізна атрыманых вынікаў;

практычная значнасць атрыманых вынікаў;

эканамічная (сацыяльна-эканамічная) значнасць атрыманых вынікаў;

асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону;

асабісты ўклад саіскальніка;

апублікаванасць вынікаў дысертацыі;

апрабацыя вынікаў дысертацыі;

структура і аб’ём дысертацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Павінна быць установлена поўная адпаведнасць, узгодненасць, паслядоўнасць задач даследавання, асноўных палажэнняў, якія выносяцца на абарону, вывадаў у канцы дысертацыі. Пры гэтым задач можа быць тры-чатыры-пяць, палажэнняў — чатыры-пяць, вывадаў — пяць-шэсцьсем, бо па кожнай задачы і па кожным палажэнні вывадаў можа быць некалькі.

4. Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону (чатыры-пяць — для кандыдацкай, шэсцьсем-восем — для доктарскай), раскрываюцца грунтоўна і фармулююцца такім чынам, каб было зразумела, **што** іменна абараняецца: не проста нейкая з'ява ці працэс, а новыя асаблівасці, заканамернасці, механізмы псіхалагічных, педагагічных, гісторыка-педагагічных з'яў і працэсаў.

5. У главе 1 даецца аналіз ідэй і палажэнняў многіх прац вучоных, якія з'яўляюцца найбольш блізкімі да праблемы дысертанта. Аднак усё ж трэба адабраць некалькі самых істотных, метадалагічна блізкіх прац, галоўныя ідэі і палажэнні якіх даследчык спрабуе развіць і ўзбагаціць.

6. У тэкст дысертацыі, аўтарэферата і ў спіс выкарыстаных крыніц абавязкова павінны быць уключаны працы класікаў педагогікі і псіхалогіі па даследуемай праблеме.

У спіс крыніц, выкарыстаных для доктарскай дысертацыі, аўтарам у алфавітным парадку даюцца свае найбольш значныя працы па тэме даследавання (манаграфіі, дапаможнікі, навуковыя артыкулы).

7. У канцы кожнай главы дысертацыі абавязкова павінны быць зроблены кароткія вывады, якія даюць магчымасць дысертанту выразна сфармуляваць вынікі кожнага этапа даследавання, лаканічна абагульніць тое галоўнае, істотнае, найважнейшае, што поўна і падрабязна раскрыта ў главах.

8. У канцы дысертацыі робяцца вывады, якія звычайна складаюцца з 6—8 буйных абагульненых пунктаў. Гэтыя вывады, вобразна кажучы, з'яўляюцца "пераплаўленым зместам" усіх глаў дысертацыі, палажэнняў, што выносяцца на абарону, і займаюць прыкладна 4—5 старонак у кандыдацкай, 5—8 — у доктарскай дысертацыях.

9. У дысертацыі і ў аўтарэфераце прозвішчы вучоных звычайна даюцца ў алфавітным парадку (А.А.Бадалёў, Я.Л.Каламінскі, І.С.Кон, Б.Ф.Ломаў, А.С.Макаранка, В.А.Сухамлінскі), рэдка — у храналагічным. У спісе выкарыстаных крыніц прозвішчы вучоных таксама даюцца ў алфавітным парадку з той толькі розніцай, што ініцыялы стаяць пасля прозвішча (Бадалёў А.А., Каламінскі Я.Л., Кон І.С. і да т.п.).

10. Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені доктара навук павінна быць навуковай кваліфікацыйнай працай прэтэндэнта, якая падрыхтавана самастойна, і адпавядаць аднаму з наступных патрабаванняў:

змяшчаць новыя даследаванні і навукова абгрунтаваныя вынікі ў канкрэтнай галіне навукі, якія ў сукупнасці вырашаюць буйную навуковую праблему;

змяшчаць новыя даследаванні, навукова абгрунтаваныя распрацоўкі і вынікі ў канкрэтнай галіне навукі, якія ў сукупнасці вырашаюць буйную прыкладную праблему;

змяшчаць новыя даследаванні і навукова абгрунтаваныя вынікі, сукупнасць якіх з'яўляецца буйным дасягненнем для развіцця пэўных напрамкаў у канкрэтнай галіне навукі.

Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені кандыдата навук павінна быць навуковай кваліфікацыйнай працай прэтэндэнта, якая падрыхтавана самастойна або пад навуковым кіраўніцтвам доктара навук (кандыдата навук), і адпавядаць аднаму з наступных патрабаванняў:

змяшчаць новыя даследаванні і навукова абгрунтаваныя вынікі па канкрэтнай спецыяльнасці адпаведнай галіны навукі, якія ў сукупнасці вырашаюць важную навуковую задачу;

змяшчаць новыя даследаванні, навукова абгрунтаваныя распрацоўкі і вынікі па канкрэтнай спецыяльнасці адпаведнай галіны навукі, якія ў сукупнасці вырашаюць важную прыкладную задачу;

змяшчаць новыя даследаванні і навукова абгрунтаваныя вынікі, сукупнасць якіх мае важнае значэнне для развіцця пэўных напрамкаў па канкрэтнай спецыяльнасці адпаведнай галіны навукі.

11. Тэма дысертацыі павінна быць зацверджана саветам арганізацыі, у якой выканана дысертацыя. Па дысертацыі можа назначацца навуковы кансультант. Дысертацыя павінна быць навуковай, тэарэтычнай і (або) эксперыментальнай працай, якая мае ўнутранае адзінства і сведчыць аб асабістым укладзе аўтара ў навуку. Яна павінна абагульнена выкладаць вынікі даследаванняў, распрацовак і сфармуляваных навуковых палажэнняў, выкананых аўтарам.

Палажэнні, распрацоўкі і вынікі, якія вылучаюцца аўтарам для публічнай абароны, павінны быць аргументаваны, крытычна ацэнены ў параўнанні з вядомымі з вызначэннем іх навуковай і практычнай значнасці, эканамічнай і сацыяльнай каштоўнасці.

У дысертацыі, якая ў сукупнасці вырашае навуковую праблему ці развівае пэўныя напрамкі навукі, павінны ўтрымлівацца звесткі аб навуковым прымяненні вынікаў даследаванняў або рэкамендацыі па іх выкарыстанні, а ў дысертацыі, якая ў сукупнасці забяспечвае вырашэнне прыкладной праблемы ці задачы, — звесткі аб практычным прымяненні атрыманых вынікаў або рэкамендацыі па іх выкарыстанні.

Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені прадстаўляецца ў выглядзе спецыяльна падрыхтаванага рукапісу, манаграфіі, падручніка, а ў асобных выпадках, з дазволу ВАКа Беларусі, — у выглядзе навуковага даклада.

12. Асноўныя палажэнні, распрацоўкі і вынікі дысертацыі, якія выносяцца на абарону, павінны быць шырока абмеркаваны навуковай грамадскасцю, апублікаваны да пачатку прыёму дысертацыі да абароны ў навуковых выданнях.

Да апублікаваных прац, калі яны ўтрымліваюць асноўныя палажэнні, распрацоўкі і вынікі дысертацыі, якія выносяцца на абарону, таксама прыраўноўваюцца:

1) апісанні вынаходстваў;

2) праграмы для ЭВМ, базы даных, алгарытмы, тапалогіі інтэгральных мікрасхем, якія прайшлі дзяржаўную рэгістрацыю;

3) інфармацыйныя карты на новыя матэрыялы, уключаныя ў дзяржаўны банк даных;

4) рукапісы работ, дэпаніраваныя ў сістэме навукова-тэхнічнай інфармацыі і коратка апісаныя ў навуковых часопісах;

5) прэпрынты, апублікаваныя тэзісы дакладаў, зробленых на навуковых з'ездах, канферэнцыях, сімпозіумах, нарадах і семінарах, іншыя працы, якія выдаюцца друкарс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

кім спосабам або на множальных апаратах і выходзяць любым тыражом.

Пры напісанні дысертацыі прэтэндэнт абавязаны даваць спасылкі на аўтараў і крыніцу, з якой ён бярэ матэрыялы або асобныя вынікі.

Пры выкарыстанні ў дысертацыі ідэй або распрацовак, што належаць асобам, разам з якімі былі напісаны навуковыя працы, прэтэндэнт абавязаны адзначыць гэта ў дысертацыі і аўтарэфераце.

Выкарыстанне чужога матэрыялу ў дысертацыі без спасылкі на аўтара і крыніцу не дапускаецца. У выпадку ўстанаўлення такіх фактаў дысертацыя здымаецца з разгляду незалежна ад стадыі праходжання без права паўторнай абароны.

13. Публікацыі павінны быць толькі па тэме дысертацыі і поўна раскрываць тэарэтычную значнасць даследавання, асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, вывады. Вядома, форма апублікавання гэтага матэрыялу можа быць некалькі іншай, чым у самой дысертацыі.

Як правіла, па доктарскай дысертацыі павінна быць апублікавана манаграфія; па кандыдацкай, акрамя тэзісаў, — некалькі навуковых артыкулаў або публікацый іншых відаў (рэкамендацыі, брашуры, раздзелы ў кнігах і да т.п.). Бо, як паказвае практыка, 3—4 тэзісы не могуць раскрыць асноўны змест дысертацыі, палажэнні, якія выносяцца на абарону, вывады. Газетныя публікацыі не ўлічваюцца і не ўключаюцца ў спіс публікацый.

14. Дадаткі да дысертацыі, нават калі яны займаюць 40—60 старонак, неабходна ўключаць у дысертацыю і не рабіць іх асобным томам.

***В.У.Чэчат,***
*доктар педагагічных навук, вучоны сакратар Савета па абароне дысертацый НІА*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ